# Дасягаем разам — працуем на будучыню


Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

**Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС** упэўнены, што падобныя сустрэчы на высокім узроўні для разгляду прагрэсу ў выкананні парадку дня ААН стануць добрай традыцыяй. На думку кіраўніка Саўміна, фармат форуму дазваляе ўмацаваць міжнароднае партнёрства і дае магчымасць для дэманстрацыі дасягненняў на нацыянальным узроўні. «Праз амаль 3,5 года пасля адабрэння дзяржавамі ААН Парадку-2030 значнасць гэтай сусветнай праграмы дзейнасці ў сферы развіцця відавочная. Перыяд усведамлення задач, якія паставіла перад сабою сусветная супольнасць, завершаны. Наступіў этап ажыццяўлення Мэт устойлівага развіцця, замацаваных у дакуменце, што азначае штодзённую карпатлівую працу», — падкрэсліў Сяргей Румас. Ён звярнуў увагу, што пытанні рэалізацыі Парадку дня ААН і дасягнення МУР з'яўляюцца важным дзяржаўным прыярытэтам і знаходзяцца ў цэнтры ўвагі Савета Міністраў. Таксама ён нагадаў, што ўжо сёлета будзе сфарміравана Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця краіны да 2035 года.

Падчас работы форуму ў дадатак да работы на секцыях прайшла прэзентацыя праекта «Садзейнічанне Рэспублікі Беларусь у нацыяналізацыі і лакалізацыі Мэт устойлівага развіцця». Працоўны дзень быў насычаны, і яго вынікі падвяла **нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна ШЧОТКІНА.** Яна падзякавала парламенцкай групе за законы, якія ўжо прынятыя і садзейнічаюць дасягненню МУР. Нарэшце ў законе аб пітным водазабеспячэнні, які вяртаўся на дапрацоўку амаль на два гады, усё ўлічана, прывяла прыклад сенатар. Акрамя таго, яна адзначыла інавацыйны закон аб арганічным земляробстве, а таксама аб нарматыўна-прававых актах, у якім указана, што разам з кожным законапраектам павінна быць удакладненне, як ён працуе на дасягненне МУР.

«Сённяшні форум — гэта пацвярджэнне нашага партнёрства», — сказала Мар'яна Шчоткіна, азначыўшы, што на мерапрыемстве прадстаўлены ўвесь спектр грамадства. — Лозунг форуму «Ва ўстойлівую будучыню — разам!» кажа пра тое, што дасягаць МУР мы павінны таксама супольнымі намаганнямі, нікога не пакідаючы ўбаку. Ёсць прапанова, каб праводзіць Нацыянальны форум па ўстойлівым развіцці не радзей, чым адзін раз на пяць гадоў».

**Надзея АНІСОВІЧ.**

**❍ У тэму**

**Па выніках экспертна-кансультацыйнай місіі MAPS («Інтэграцыя, паскарэнне і падтрымка палітыкі»), якая была арганізавана ААН у супрацоўніцтве з Беларуссю, наша краіна дасягнула значных поспехаў ва ўстойлівым развіцці. У Дакладзе аб чалавечым развіцці 2016 года Беларусь заняла 52-е месца сярод 188 краін і ўвайшла ў групу краін з даходамі вышэй за сярэдні. Эксперты MAPS прапанавалі чатыры платформы паскарэння рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця. Першая — «зялёны» пераход да інклюзіўнага і ўстойлівага росту. Другая — арыентацыя на будучыя пакаленні. Трэцяя — лічбавая трансфармацыя і сацыяльныя інавацыі. Чацвёртая — гендарная роўнасць. Калі наша краіна будзе звяртаць больш увагі на гэтыя пункты, будзе лягчэй дасягнуць комплексу ўзаемазвязаных МУР.**

# УЗЯЦЬ ТАК, КАБ ПАКІНУЦЬ

## Наш дабрабыт не павінен ствараць у будучым праблемы для нашых дзяцей

**Мы ўсе жадаем жыць так, каб усяго было ў дастатку. Гэта калі ёсць усё неабходнае і не трэба думаць, чым накарміць сям'ю, што апрануць і на якія грошы купіць лекі ў выпадку хваробы. Канешне, хочацца і большага: вандраваць, атрымліваць асалоду ад твораў мастацтва, займацца спортам або любімым хобі... Гэта магчыма, калі ў краіне паспяхова працуе эканоміка — забяспечаны яе рост.**

Але эканамічны рост патрабуе рэсурсаў: чалавечых і іншых, самых розных. І тут важна не паўтарыць лёс пасляваеннага пакалення, якое аказалася цалкам выпрацаваным па дасягненні пенсійнага ўзросту. І не дапусціць пагаршэння экалогіі з-за высечкі лясоў дзеля атрымання валюты. Бо тады не будзе здароўя, каб дастаткова доўга і якасна працаваць і развіваць эканоміку краіны далей.

Вось чаму эканоміка — ключавы кампанент усёй сістэмы ўстойлівага развіцця, дзе выкарыстанне рэсурсаў павінна быць максімальна збалансаваным і мэтазгодным. Пра тое, як гэтага дасягнуць, ішла размова на першай сесіі Нацыянальнага форуму па ўстойлівым развіцці.

### Не памыліцца ў выбары

Асноўны інструмент забеспячэння такога эканамічнага росту, які не пераўтворыцца ў праблемы для будучых пакаленняў, — Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця. Летась была распачата карэкціроўка дзеючай версіі — гэта будзе ўжо пятая Нацыянальная стратэгія ў гісторыі сучаснай Беларусі. Яна складаецца на новы тэрмін — да 2035 года.



«Для таго каб якасна яе распрацаваць, мы стварылі грамадскі савет, у які ўвайшлі 30 найлепшых экспертаў з самых розных галін навукі, адукацыі, з міжнародных арганізацый, бізнесу, грамадзянскай супольнасці, — расказаў **мадэратар секцыі міністр эканомікі Беларусі Дзмітрый КРУТОЙ.** — Летась было праведзена сем круглых сталоў, мы шырока абмяркоўвалі новыя прыярытэты і задачы Мэт устойлівага развіцця. Вострая дыскусія разгарнулася па прыярытэтах навукова-тэхналагічнага прагрэсу і пры абмеркаванні тэмы рэгіянальнай палітыкі».

У канцэпцыі Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця абазначаны пяць прыярытэтаў. Першы: стварэнне годных рабочых месцаў, якія забяспечваюць роўныя магчымасці ў любым узросце. Другі: лічбавізацыя краіны, паўсюднае ўкараненне інавацый і якасная адукацыя. Трэці: устойлівае развіццё інстытута сям'і, патэнцыялу дзяцей і моладзі. Чацвёрты: стварэнне ўстойлівай інфраструктуры, камфортнага і канкурэнтаздольнага бізнес-асяроддзя. Пяты: гарантаванне экалагічнай бяспекі на аснове развіцця «зялёнай» эканомікі, рацыянальных мадэляў вытворчасці і спажывання.

«Працягваецца дыскусія наконт шостага прыярытэту — рэгіянальнага развіцця, — дадаў Дзмітрый Крутой. — Пакуль, канешне, гэта вельмі сыры дакумент. Галоўная асаблівасць новай стратэгіі ў тым, што мы ўжо на сто працэнтаў сплучаем яе з глабальнымі Мэтамі ўстойлівага развіцця». Дзеючая стратэгія спалучаецца з глабальнымі мэтамі толькі на 75 %.


Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

### Што дапаможа

Сусветны эканамічны крызіс 2008—2009 гадоў прымусіў усе краіны ўносіць карэкціроўкі ў сваё развіццё. Наша не стала выключэннем.



«У Беларусі з 2010 года распачынаюцца асаблівыя намаганні па мадэрнізацыі сваёй прамысловасці ва ўмовах захавання доступу да расійскай эканамічнай прасторы, — адзначыў у сваім дакладзе **Юрый ШАЎЦОЎ, дырэктар Цэнтра па праблемах еўрапейскай інтэграцыі.** — Асабліва важная паспяховая рэалізацыя праекта будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі. Гэта самы буйны інвестыцыйны праект на тэрыторыі Беларусі, які паўплывае на ўсю эканоміку краіны: закладзе аснову для ўласнай атамнай прамысловасці і з'явіцца стымулам для развіцця электратэхнічнай індустрыі».

Важным новым элементам мадэрнізацыі Беларусі з'яўляецца хуткае развіццё IT-сектара. Вядучая структура гэтай галіны — Парк высокіх тэхналогій — штогод забяспечвае 20—40-працэнтны рост свайго экспарту. Калі тэмп росту захаваецца, то за 5—10 гадоў IT-экспарт можа вырасці да пяці і больш мільярдаў долараў у год, што дазволіць у значнай ступені пазбегнуць уразлівасці айчыннай эканомікі.

«Асаблівае значэнне мае тое, што IT-сектар працуе пераважна на рынкі ЗША і Еўрапейскага саюза. Праз гэта Беларусь аказваецца ўцягнутая ў развіццё вельмі магутных глабальных гульцоў», — лічыць эксперт.

Трэцяй рухальнай сілай павінен стаць Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Аддача, якая чакаецца, — 50 мільярдаў долараў экспарту на працягу 10—15 гадоў. «Для Беларусі праект з'яўляецца стратэгічна важным пунктам уваходу ў эканоміку КНР, якая хутка развіваецца», — дадаў Юрый Шаўцоў.

Найбольш маштабным транзітным праектам на шляху паміж ЕС і Кітаем можа стаць рэалізацыя ідэі будаўніцтва высакаскараснай грузa-пасажырскай чыгункі з Германіі ў КНР праз Польшчу, Беларусь, Расію і Казахстан. «У выпадку поспеху інвестыцыі ў транспартную інфраструктуру на тэрыторыі нашай краіны могуць перавысіць па сваім аб'ёме інвестыцыі ў будаўніцтва БелАЭС», — лічыць эксперт.

У якасці дадатковага драйвера для тэхналагічнага развіцця беларускай прамысловасці ён назваў развіты ваенна-прамысловы комплекс і мадэрнізацыю транспартных артэрый на тэрыторыі Літвы, Латвіі і Усходняй Польшчы. Апошняе ў хуткім часе значна палепшыць умовы для транспартных зносін паміж Беларуссю і марскімі партамі прыбалтыйскіх краін.

14 стар.